## РЭПАРТАЖ

# ПРАЗ 45 ГАДОЎ

Гаўрылоўка... Вёска беларускай зямлі, жыхары якой першымі пачулі пераможны кліч савецкіх салдат-вызваліцеляў і першымі прынялі іх у свае абдымкі.

— Вунь з таго боку ішлі вызваліцелі, — паказвае ў бок зялёнага лугу старэйшы жыхар вёскі Ф. М. Аксёненка. — На конях скакалі. Мы ўсе спалохаліся, думалі, немцы. Хавацца пабеглі. А потым, чуем, крычаць нам услед: «Не бойцеся, мы — савецкія салдаты. Мы — свае». Тады мы кінуліся насустрач ім. Жанчыны пабеглі ў хаты за малаком, салам. Кожны выносіў, што было. Радасны гоман узняўся вакол, адбымацца пачалі са сваімі дарагімі вызваліцелямі, цалавацца. Не перадаць мне зараз той радасці і таго настрою, што панаваў тады ў нашай вёсцы, — махнуў рукой Фёдар Міхайлавіч.

20 верасня 1988 года. На маляўнічым, не па асенняму зялёным лужку, уздоўж адзінай вясковай вуліцы выстраілася калона легкавых аўтамашын і аўтобусаў. Сакратар райкома камсамола Т. Антоненка раз-пораз падыходзіць да дзяўчат і хлопцаў у нацыянальных беларускіх касцюмах, яшчэ і яшчэ раз аглядае іх прыдзірлівым позіркам, удакладняе, ці ўсё гатова да сустрэчы. Крыху ў баку, захаваўшы ў душы хваляванне, стаяць сакратар РК КПБ М. М. Гердзій, старшыня калгаса «Бальшавік» А. А. Кужалеў, старшыня Вялікаліпаўскага сельскага Савета А. М. Смірноў, прадстаўнікі раённага савета ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, райкома камсамола, грамадскіх арганізацый Хоцімскага раёна. Жменька жыхароў вёскі Гаўрылоўка сціпла прыстроілася побач, раз-пораз кідаючы слязлівыя позіркі на лужок, за зялёны лясочак. Адтуль 45 гадоў назад, з воінамі 324-й стралковай дывізіі прыйшло вызваленне на беларускую зямлю. Шмат вызваліцеляў — салдат памятаюць застаўшыеся жыхары Гаўрылоўкі ў твар. Можа сёння давядзецца некага з іх убачыць зноў? А наогул, ці застаўся хто з іх у жывых? Хвалюцца старажылы, чакаюць.

Нарэшце, паказваецца крытая аўтамашына. Павольна спыняецца яна каля сустракаючых. Праз некалькі хвілін з яе,ззяючы ўзнагародамі, выходзяць сівавалосыя жанчыны і мужчыны. На вачах, у тонкай аправе частых зморшчынак — кропелькі радасных, шчаслівых слёз. Колькасць прыбыўшых каля двух дзесяткаў чалавек, большасць — мужчыны, жанчын толькі чатыры. Вось у такім саставе і выглядзе ступіла на зямлю Хоцімшчыны, праз 45 гадоў, 324-я стралковая Верхнедняпроўская Чырвонасцяжная дывізія.

Да былых салдат накіроўваюцца дзяўчаты ў нацыянальных беларускіх касцюмах з прыгожым беларускім хлебам-соллю ў руках. Нізкі паклон — і яго прымае старшыня савета ветэранаў 324-й стралковай дывізіі П. С. Маглоў. Астатніх ветэранаў школьнікі Вялікаліпаўскай васьмігадовай школы частуюць мясцовымі духмянымі антонаўкамі, уручаюць ім букеты жывых кветак, памятныя сувеніры.

Гасцей вітаюць сакратар РК КПБ М. М. Гердзій, старшыня Вялікаліпаўскага сельскага Савета А. М. Смірноў, старшыня калгаса «Бальшавік» А. А. Кужалеў, старшыня раённага савета ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны А. А. Федасенка, жыхары вёскі Гаўрылоўка.

Паміж гасцямі і прысутнымі завязваецца шчырая размова, зацікаўлены абмен думкамі па хвалюючых пытаннях сучаснасці і ваеннага мінулага нашай Радзімы.

Затым аўтобусы і легкавыя аўтамашыны з гасцямі і сустракаючымі накіроўваюцца ў бок цэнтральнай сядзібы калгаса «Бальшавік», вёскі Ліпаўка. Тут каля сельскага Дома культуры ўжо чакаюць ветэранаў 324-й стралковай дывізіі жыхары вёскі. З шырокіх вокнаў СДК даносіцца мелодыя папулярнай ваеннай песні. І зноў — знаёмства, абдымкі, сяброўскія поціскі рук.

На ганку Дома культуры былых салдат сустракаюць школьнікі з вялікай квяцістай гірляндай. Беражна бяруць яе ў рукі ветэраны і так жа беражна нясуць і ўскладваюць да помніка загінуўшым у Вялікай Айчыннай вайне воінам.

На хвіліну замаўкаюць каля помніка ўсе прысутныя. Кожны думае ў гэту жалобную хвіліну аб адным — аб ахвярах Вялікай Айчыннай, яе пакутах і горы, якія прынесла яна савецкім людзям.

Ветэраны 324-й стралковай дывізіі прагна ўглядаюцца ў залатыя літары імён і прозвішчаў — шукаюць сваіх сяброў і знаёмых. Так, у гэтай зямлі іх засталося значна больш, чым стаіць зараз ля помніка. На тварах жывых кацяцца горкія слёзы.

— А зараз фотаздымак на памяць, — запрашае бліжэй да помніка ветэранаў, гасцей, прадстаўнікоў раённага савета ветэранаў і жыхароў вёскі старшыня сельскага Савета.

На экране глядзельнай залы Вялікаліпаўскага СДК эпізоды з ваеннага мінулага нашай шматпакутнай Радзімы: разбураныя вёскі, гарады, выбухі снарадаў, параненыя салдаты.

— Толькі што мы праглядзелі некалькі кадраў ваеннай хронікі, — гаворыць А. М. Смірноў. — Яшчэ раз упэўніліся, як гэта страшна, калі гінуць людзі і ірвуцца бомбы. Якое вялікае шчасце, што мы не ведаем гэтага вось ужо 43 гады, а Хоцімшчына — ужо 45. Немалая заслуга ў гэтым сённяшніх гасцей нашага раёна. Прыміце нізкі паклон і ўдзячнасць, ветэраны 324-й стралковай дывізіі, ад жыхароў нашай вёскі і ўсяго Вялікаліпаўскага сельсавета, хацімчан.

Ад імя райкома КПБ ветэранам дзякуе М. М. Гердзій.

Са словам у адказ выступіў П. С. Маглоў. Ён сказаў:

— Мы з задавальненнем успрынялі прапанову пабываць на месцах, дзе нам давялося ваяваць у час Вялікай Айчыннай вайны. На сустрэчу прыехалі далёка не ўсе нашы аднапалчане. Многіх ужо няма ў жывых, многія жывуць у самых аддаленых кутках нашай Радзімы. У саставе нашай дэлегацыі ветэраны з Чувашыі, Украіны, Малдавіі. Усе яны вызвалялі беларускую зямлю ад фашысцкай нечысці.

У далейшым выступленні П. С. Маглоў падзяліўся ўспамінамі аб ваенным мінулым, выказаў вялікую ўдзячнасць кіраўніцтву раёна і калгаса «Бальшавік» за цёплы прыём.

Пасля адбыўся канцэрт мастацкай самадзейнасці, падрыхтаваны работнікамі Вялікаліпаўскага СДК і бібліятэкі.

Далейшы шлях ветэранаў 324-й стралковай Верхнедняпроўскай Чырвонасцяжнай дывізіі — у суседнія раёны: Клімавіцкі, Чэрыкаўскі, Слаўгарадскі.

**Н. САЛАБУТА.**

**Салабута, Н. Рэпартаж праз 45 гадоў** : [аб сустрэчы жыхароў в. Гаўрылоўка з ветэранамі 324-й стралковай дэвізіі] / Н. Салабута // Шлях Кастрычніка. — 1988. — 24 верасня. — С. 1.